ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 261 (333) | Субота 16 лістапада 1940 г. | Цана 10 кап.

Выданне другой часткі XIII тома твораў К. Маркса і Ф. Энгельса

У бліжэйшыя дні выходзіць у свет папрыхтаваны інстытутам Маркса—Энгельса—Леніна пры ЦК ВКП(б) XIII том (другая частка) твораў К. Маркса і Ф. Энгельса. У яго ўключаны работы Маркса і Энгельса ад пачатку франка-прускай вайны (ліпень 1870 г.) па канец 1872 г. Змешчана таксама брашура, выпушчаная летам 1873 г.: „Альянс сацыялістычнай дэмакратыі і міжнароднае таварыства рабочых" — апошняя з работ, якія адносяцца да Інтэрнацыянала.

Пераважаючае месца займаюць дакументы Інтэрнацыянала: звароты, адозвы, маніфесты, аўтарам якіх быў пераважна Маркс, а часткова і Энгельс. Многія дакументы прысвечаны барацьбе супроць бакуніама.

Першую частку тома запаўняюць васныя артыкулы Энгельса — „Заметкі аб вайне". У асобным аддзеле змешчаны запісы прамоў Маркса і Энгельса 1870—1872 гг.

У дадатку да XIII тома прыведзена пісьмо дачкі Маркса Жэні аб праследаваннях, якім яна і яе сястра падвергліся з боку ўрада Цьера. (ТАСС).

ПАЛЕПШЫЦЬ МЕДЫЦЫНСКАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ПРАЦОЎНЫХ

За год новага жыцця, на вызваленай ад белапольскіх акупантаў зямлі адбыліся вялікія змены. Яны адчуваюцца ў пераможным рытме гудкоў фабрык і заводаў, у рокаце трактараў на калгасных нівах, у плённай стахановскай працы рабочых і калгаснікаў. Гэтыя змены наглядна бачны і ў росце культуры, у росце добрабыту насельніцтва заходніх абласцей.

Клопаты аб чалавеку працы, аб яго здароўі і добрабыце штодзённа праяўляюцца комуністычнай партыяй і Совецкім урадам. Ды інакш і быць не можа. „Капіталіст, — пісаў Энгельс, — змагаецца за прыбытак, рабочы — за сваё здароўе .." (Энгельс аб „Капітале" Маркса, партвыдавецтва 1933 год, стар. 8).

У нашай краіне, дзе ва ўладзе стаяць працоўныя, яны самі клапоцяцца аб сваім здароўі і добрабыце. Дастаткова прывесці лічбы і факты з мінулага і сучаснага нашай абласці, каб пераканацца яшчэ раз у праўдзівасці і жыццёвасці вышэй прыведзеных слоў Фрыдрыха Энгельса.

Правячая кліка былой панскай Польшчы не клапацілася аб добрабыце працоўных і асабліва ў раёнах Палесся. На тэрыторыі, якую аб'ядная зараз наша Брэсцкая абласць, было толькі 6 бальніц на 381 ложак, 9 амбулаторый, 7 венерычных і туберкулёзных дыспансераў. У абласці працавала 78 урачоў, якія ў сваёй большасці займаліся прыватнай практыкай.

Не ўсякаму працоўнаму было даступна лячэнне, бо за яго патрэбна было плаціць: за амбулаторны прыём, перавязку, лякарствы. Зусім невыпадкова, што большасць насельніцтва не прыбягала да паслуг урачоў і медыцынскіх устаноў, а лячылася ва ўсякіх знахараў, бабак, шаптуноў. Гэтыя „лекары" адпраўлялі дзесяткі тысяч людзей на „той свет".

Чахотка, сіфіліс, экземы, каўтуны, воспа былі частымі „гасцямі" у бяднацкіх лачугах сялян, у бараках гарадскіх рабочых пасёлкаў.

За адзін год совецкай улады ў вызваленых раёнах у корні змянілася справа аховы здароўя.

На ўтрыманне медыцынскіх устаноў, зарплату ўрачам і абслугоўваючаму персаналу бальніц, амбулаторый за 10 месяцаў гэтага года выдаткавана 18 мільёнаў 850 тысяч рублёў. У 1937 — 38 годзе на тэрыторыі цяперашняй Брэсцкай абласці на ўтрыманне медыцынскіх устаноў польскімі ўладамі было затрачана 560 тысяч 074 злотых.

У Брэсце пабудавана новая бальніца на 250 ложкаў. Бальніца абсталявана па апошняму слову тэхнікі і навукі. Тут будзе электрычнае, вадзяное і светавое лячэнне. У раённых центрах і вёсках арганізаваны новыя 22 бальніцы, у якіх колькасць ложкаў павялічылася ў 4 разы ў параўнанні з колькасцю, якая была ў 1938 годзе на тэрыторыі абласці. Створана 28 сельскіх урачэбных участкаў. У вёсках раёна арганізаваны і працуюць 65 фельчарска-акушорскіх пунктаў. Арганізаваны 12 новых амбулаторый, 8 дзіцячых і жаночых кансультацый, малочная кухня, 13 санітарных станцый, 3 станцыі па пераліванню крыві і 18 пунктаў па абслугоўванню медыцынскай дапамогай рабочых і служачых прадпрыемстваў.

У медыцынскіх установах абласці працуе больш тысячы людзей. Гэта вялікая армія заклікана да пачэснай і ганаровай работы—ахоўваць здароўе людзей—самага каштоўнага капіталу ў свеце.

Большасць медыцынскіх работнікаў добрасумлённа адносіцца да сваёй работы. Загадчык Пружанскай бальніцы доктар тав. Розенкрац на належную вышыню ўзняў работу бальніцы.

Вялікай любоўю сярод працоўных Пружан карыстаецца ўрач тав. Бронштэйн — загадчык раённым домам у Пружанах. Ён быў ініцыятарам арганізацыі раёнага дома, устанавіў там узорны парадак. Утульнасць, чыстата — вось характэрныя рысы, якімі можна ахарактарызаваць раённы дом у Пружанах. Тут праяўлены вялікія клопаты аб маці-ры-рожаніцы. Добра арганізавана харчаванне. Прадугледжаны ўсе дробязі для лепшага абслугоўвання хворых.

Сваёй адданай работай многія медыцынскія работнікі ўдастоіліся вялікага давер'я народа, іх вылучылі кандыдатамі ў депутаты абласнога, раённых, гарадскіх і сельскіх Саветаў депутатаў працоўных.

Працоўныя Гайнаўкі вылучылі кандыдатам у депутаты абласнога Совета загадчыка мясцовай бальніцы тав. Ендрушык, які прарабіў у Гайнаўцы вялікую работу ў справе арганізацыі лепшага абслугоўвання і лячэння насельніцтва. Сяляне вёскі Олтуш вылучылі кандыдатам у депутаты раённага Совета фельчара-энтузіястку тав. Варанчук, якая карыстаецца вялікай любоўю ў сялян навакольных вёсак, за сваю адданасць рабоце. У Дывіне кандыдатам у депутаты абласнога Совета вылучана ўрач Хана Юдалеўна Прыходоўская.

Зразумела, што побач з дасягненнямі ў галіне аховы здароўя патрэбна яшчэ вельмі многа зрабіць, тут ёсць яшчэ многа недахопаў, якія патрэбна выправіць. Вельмі мала абласны аддзел аховы здароўя ўдаляе ўвагі сельскім урачэбным участкам і фельчарска-акушорскім пунктам. Большасць гэтых нізавых устаноў вялікай сеткі аховы здароўя недастаткова забяспечаны патрэбным інструментарыем, знаходзяцца ў непрыстасаваных памяшканнях (вёска Вялікарыта).

Нялаўна ў абласць была прыслана з Наркамздрава 23 зубных урачы. Да апошняга часу гэтыя таварышы не прыступілі да сваёй работы толькі таму, што адсутнічаюць інструменты.

Асобныя кіраўнікі раённых партыйных і совецкіх арганізацый недастаткова ўдзяляюць увагі лепшаму валадванню аховы здароўя працоўных. У Дывіне, Кляшчелах ніяк не могуць знайсці памяшканняў пад амбулаторыі і бальніцы. Установы аховы здароўя не забяспечаны на зіму палівам. Гэта адзіныя два раёны, дзе кіраўнікі так дрэнна адносяцца да гэтай важнай справы.

Яшчэ дрэнна ў нашай абласці пастаўлена абслугоўванне хворых на даму. Безадказна працуе хуткая дапамога. Сярод медыцынскіх работнікаў аказаліся прагульшчыкі, якіх народу прышлося прызваць да парадку (Іванова, Мароз, Тімошык).

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі медыцынскіх устаноў ведуць слабую выхаваўчую работу сярод урачоў, медсясцёр. У выніку чаго ў многіх працуючых у амбулаторыях, бальніцах ёсць імкненне займацца прыватнай практыкай і браць за гэта з хворых баснаслоўна высокія цэны.

Вызвалены народ рыхтуецца да вялікіх урачыстасцей—выбараў у мясцовыя Саветы депутатаў працоўных. Іх снежня працоўныя сустракаюць, як сапраўднае свята стахановскай работай на прадпрыемствах і ўстановах. Задача медыцынскіх работнікаў у сваёй штодзённай удзячнай рабоце лепш абслугоўваць насельніцтва, клапаціцца аб здароўі самых шчаслівых у свеце совецкіх грамадзян.

ХРОНІКА

Саўнарком Саюза ССР назначыў тав. Чадаева Якава Ермалаевіча кіраўніком Справамі СНК СССР, вызваліўшы ад пасады Кіраўніка Спр[illegible] Хломава Міхаіла [illegible]

Святкаванне ў Маскве XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Рэволюцыі.
Злева направа: І. В. Сталін, М. І. Калінін, К. Е. Варашылаў і В. М Молатаў на трыбуне мавзалея.
Фота Ф. Кісілова. *Фота ТАСС.*

Кандыдаты ў дэпутаты

Брэсцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных, зарэгістраваныя акруговымі выбарчымі камісіямі па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных

Антопальская выбарчая акруга № 1.

Макеенка Фёдар Варфаламеевіч, 1902 года нараджэння, член ВКП(б), намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкома, вылучаны агульнымі сходамі сялян сяла Антопаль і вёскі Першамайск, Антопальскага раёна.

Гарадзецкая выбарчая акруга № 2

Лазоўскі Павел Венедзіктавіч, 1896 года нараджэння, член ВКП(б), старшыня Антопальскага райвыканкома, вылучаны агульным сходам сялян вёскі Акцябр, Антопальскага раёна.

Дзяткаўская выбарчая акруга № 3.

Сідарук Праскоўя Сямёнаўна, 1909 года нараджэння, беспартыйная, старшыня Гарадзецкага сельсовета Антопальскага раёна, вылучаная сходам сялян вёскі Заніўе, Антопальскага раёна.

Маскоўская выбарчая акруга № 4

Салавей Іосіф Мендзелевіч, 1903 года нараджэння, член ВКП(б), старшыня абласной планавай камісіі, вылучаны агульным сходам рабочых друкарні імені Варашылава гор. Брэста.

Цэнтральная выбарчая акруга № 5.

Дульчэўская Екацярына Вікенцьеўна, 1900 года нараджэння, беспартыйная, брыгадзір Брэсцкага водачнага завода „Вызваленая праца", вылучана агульным сходам рабочых і служачых водачнага завода „Вызваленая праца".

Дзержынская выбарчая акруга № 6

Рашчынскі Павел Мефодзьевіч, 1907 года нараджэння, член ВКП(б), старшыня Брэсцкага горвыканкома, вылучаны агульнымі сходамі рабочых і служачых хлебакамбіната, піваварнага завода і млыноў № 4 і № 5.

Пушкінская выбарчая акруга № 7

Сікорскі Сяргей Іванавіч, 1907 года нараджэння, член ВКП(б), сакратар Брэсцкага абкома КП(б)Б, вылучаны агульным сходам рабочых і служачых брэсцкай электрастанцыі.

Чыгуначная выбарчая акруга № 9

Сідарук Нікалай Андрэевіч, 1906 года нараджэння, беспартыйны, майстар сталярнага цэха галоўных вагонных майстэрняў, вылучаны агульным сходам рабочых і служачых галоўных вагонных майстэрняў станцыі Брэст-Цалескі.

Бярозаўская выбарчая акруга № 10

Мазураў Кірыл Трафімавіч, 1914 года нараджэння, член ВКП(б), сакратар Брэсцкага абкома ЛКСМБ, вылучаны Бярозаўскай раённай комсамольскай арганізацыяй.

[illegible]

аблвыканкома, вылучаны агульным сходам рабочых і служачых Пасхоўскага спіртзавода.

Сялецкая выбарчая акруга № 12

Рупока Спяпан Нікітавіч, 1904 года нараджэння, беспартыйны, старшыня калгаса „Чырвоная звязда", Бярозаўскага раёна, вылучаны агульным сходам калгаснікаў калгаса „Чырвоная Звязда".

Блудзенская выбарчая акруга № 13

Шелепетка Міхаіл Сцяпанавіч 1916 года нараджэння, член ЛКСМБ, калгаснік калгаса „Зара" Бярозаўскага раёна, вылучаны агульным сходам калгаснікаў калгаса „Зара".

Междулесская выбарчая акруга № 14.

Янчэўскі Антон Станіслававіч, 1908 года нараджэння, член ВКП(б), загадчык Бярозаўскага земельнага аддзела, вылучаны агульным сходам сялян вёскі Б. Междулессе, Бярозаўскага раёна.

Лышчыцкая выбарчая акруга № 15

Ільін Ефім Ільіч, 1901 года нараджэння, член ВКП(б), ваеннаслужачы, вылучаны агульным сходам калгаснікаў калгаса імені Дзержынскага, Матыкальскага сельсовета, Брэсцкага раёна.

Камянец-Жыравіцкая выбарчая акруга № 16.

Дзівінчук Філіп Ігнацьевіч, 1900 года нараджэння, беспартыйны, старшыня калгаса імені Варашылава, Камянец-Жыравіцкага сельсовета, Брэсцкага раёна, вылучаны агульным сходам калгаснікаў калгаса імені Варашылава, Камянец-Жыравіцкага сельсовета, Брэсцкага раёна.

Бярозаўская выбарчая акруга № 17.

Бандаровіч Марк Раманавіч, 1894 года нараджэння, член ВКП(б), намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкома, вылучаны сходамі сялян вёсак Бярозаўка і Плоская, Бярозаўскага сельсовета, Брэсцкага раёна.

Казловіцкая выбарчая акруга № 18.

Тупіцын Міхаіл Нікалаевіч, 1906 года нараджэння, член ВКП(б), першы сакратар Брэсцкага абкома КП(б)Б, вылучаны агульным сходам калгаснікаў, калгаса імені Сталіна, Казловіцкага сельсовета, Брэсцкага раёна.

Высокаўская выбарчая акруга № 19.

Дружынін Аляксандр Іванавіч, 1905 года нараджэння, член ВКП(б), сакратар Брэсцкага абкома КП(б)Б, вылучаны агульным сходам Высокаўскай раённай партыйнай арганізацыі.

Волчынская выбарчая акруга № 20.

[illegible] Дзямянцій Грыгор'евіч, [illegible] нараджэння, беспартыйны, [illegible] Волчынскага сельсавета Высокаўскага раёна.

Верховіцкая выбарчая акруга № 21

Красненкоў Фама Пракоф'евіч, 1899 года нараджэння, член ВКП(б), старшыня Высокаўскага райвыканкома, вылучаны агульным сходам первічнай партыйнай арганізацыі Высокаўскага райвыканкома.

Гайнаўская гарадская выбарчая акруга № 22

Ендрушак Антон Іосіфавіч 1900 года нараджэння, беспартыйны, урач Гайнаўскай бальніцы, вылучаны агульным сходам рабочых і служачых Гайнаўскага лесазавода імені Варашылава.

Гайнаўская сельская выбарчая акруга № 23

Алебры Владзіслаў Іванавіч, 1907 года нараджэння, беспартыйны, рабочы Гайнаўскага лесахімзавода, вылучаны агульным сходам рабочых і служачых гайнаўскага лесахімзавода.

Старакорнінская выбарчая акруга № 24

Кот Канстанцін Сцефанавіч, 1905 года нараджэння, беспартыйны, старшыня Старакорнінскага сельсовета, Гайнаўскага раёна, вылучаны агульным сходам сялян вёскі Старакорніна, Гайнаўскага раёна.

Белавежская выбарчая акруга № 25

Літвінка Іван Васілевіч, 1898 года нараджэння, член ВКП(б), старшыня Гайнаўскага райвыканкома, вылучаны агульным сходам рабочых і служачых Белавежскага дзяржаўнага запаведніка.

Нарэўская выбарчая акруга № 26

Кавальчук Вітольд Юльянавіч, 1902 года нараджэння, член ВКП(б), загадчык Брэсцкім абласным аддзелам аховы здароўя, вылучаны агульным сходам служачых Нарэўскай амбулаторыі.

Дывінская выбарчая акруга 27

Лепацін Канстанцін Міронавіч, 1896 года нараджэння, член ВКП(б), старшыня Дывінскага райвыканкома, вылучаны агульнымі сходамі медыцынскіх работнікаў і работнікаў сувязі Дывінскага раёна.

Навасёлкаўская выбарчая акруга № 28

Прыходоўская Хана Юдалеўна, 1917 года нараджэння, беспартыйная, урач, загадчык Дывінскай бальніцы, вылучана агульнымі сходамі настаўнікаў, медработнікаў і сялян вёскі Навасёлкі, Дывінскага раёна.

Дамачэўская выбарчая акруга № 29

Харманская Паўліна Станіслаўна, 1896 года нараджэння, беспартыйная, настаўніца Лепляўскай школы, вылучаная агульным сходам сялян вёскі Лепляўка, Дамачэўскага раёна.

Працяг на 3 старонцы.

Заключная гутарка паміж тав. Молатавым і п. фон-Рыбентропам

БЕРЛІН, 14 лістапада. (ТАСС). 13 лістапада вечарам паміж Старшынёй Совета Народных Камісараў СССР і Народным Камісарам Замежных Спраў тав. В. М. Молатавым і міністрам замежных спраў Германіі п. фон-Рыбентропам адбылася заключная гутарка.

Ад'езд Старшыні Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. Молатава з Берліна

БЕРЛІН, 14 лістапада. (ТАСС). Сёння, пасля 2-дзённага прабывання ў Берліне, выехаў у Маскву Старшыня Соўнаркома СССР і Народны Камісар Замежных Спраў тав. В. М. Молатаў. Разам з ім выехалі ў Маскву Нарком Чорнай Металургіі тав. Тевасян І. Т., намеснік Народнага Камісара Замежных Спраў тав Дзеканозаў В. Г. і другія суправаджаючыя тав. Молатава асобы.

У Маскву таксама выехалі германскі пасол у СССР фон дэр Шуленбург і паўпрэд СССР у Берліне тав. Шкварцаў.

У адзінаццатай гадзіне раніцы па берлінскаму часу германскі міністр замежных спраў п. фон-Рыбентроп заехаў за тав. Молатавым у замак Бельвю для таго, каб праваДзіць яго на Ангальцскі вакзал.

Провады тав. Молатава адбываліся ва ўрачыстай абстаноўцы. Ангальцскі вакзал быў упрыгожан зеленню і кветкамі. Ля галоўнага ўваходу былі вывешаны дзяржаўныя сцягі СССР і Германіі. На прывакзальнай плошчы ў чэсць тав. Молатава была выстраена рота пачотнай варты. Таварыш Молатаў з п. фон Рыбентропам правялі ўздоўж фронта пачотнай варты.

Для праваДу з германскай стараны, акрамя п. фон-Рыбентропа, прыбылі: імперскі міністр доктар Ламерс, начальнік германскай паліцыі п. Гімлер, кіраўнік германскага працоўнага фронта доктар Лей, начальнік аддзела друку пры Германскім урадзе доктар Дэтрых, стато-сакратары міністэрства замежных спраў фон Вейцзекер, Боле і Кеплер, пасол Рытэр, намеснік Гітлера генерал Валюге, генерал Томас, які прадстаўляў генерал - фельдмаршала Кейтэля, камендант Берліна генерал-лейтэнант Зейферт, бургамістр Берліна Штэег, пасланнікі Альтэнбург, фон-Твардоўскі, Лютнер, фон-Рынтэлен, Гевельс, кіраўнік аддзела друку Міністэрства Замежных Спраў Шміт і прадстаўнікі друку.

Тав. Молатава праваджалі таксама супрацоўнікі паўпрадства і гандлёвага прадстаўніцтва СССР у Берліне, з якімі тав. Молатаў цёпла развітаўся.

Падзякаваўшы п. фон-Рыбентропа за аказаны прыём, тав. Молатаў развітаўся з суправаджаючымі яго прадстаўнікамі Германскага ўрада.

У 11 гадзін па берлінскаму часу поезд адышоў ад перона вакзала.

Камюніке аб перагаворах Старшыні Соўнаркома СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. М. Молатава з кіраўнікамі германскага ўрада

У часе прабывання ў Берліне па працягу 12 — 13 лістапада гг. Старшыня Совета Народных Камісараў СССР і Народны Камісар Замежных Спраў т. В.М. Молатаў меў гутарку з рэйсханцлерам п. А. Гітлерам і міністрам Замежных Спраў п. фон-Рыбентропам. Абмен думак працякаў у атмасферы ўзаемнага давер'я і ўстанавіў узаемнае разуменне па ўсіх важнейшых пытаннях, якія цікавяць СССР і Германію.

Тав. В. М. Молатаў меў таксама гутарку з рэйхсмаршалам п. Герынгам і намеснікам п. Гітлера па партыі нацыянал-сацыялістаў п. Гесам.

14 лістапада [illegible] Старшыня [illegible] Совета Народных Камісараў СССР і Народны Камісар Замежных Спраў тав. В. М. Молатаў [illegible] у Маскву.

234

На нарадзе старшынь і сакратароў участковых выбарчых камісій

Днямі ў абласным Доме партыйнай асветы адбылася нарада старшынь, іх намеснікаў і сакратароў участковых выбарчых камісій па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Удзельнікі нарады падвялі вынікі сваёй работы за прайшоўшы час і намецілі далейшыя мерапрыемствы ў разгортванні агітацыйна-масавай работы на выбарчых участках. Рэзкай крытыцы была падвергнута слабая работа горвыканкома ў справе абсталявання выбарчых участкаў.

Старшыня Маякоўскай участковай выбарчай камісіі тав. Далінскі ў сваім выступленні застанаўліваецца на тым, як на ўчастку разгорнута работа. Вывешаны спісы выбаршчыкаў, рэгулярна праводзяцца заняткі па вывучэнню выбарчага закона. Камісія намеціла 16 лістапада склікаць сход выбаршчыкаў участка па пытанню падрыхтоўкі да выбараў. Аднак прамоўца прызнае, што ў спісах выбаршчыкаў маюцца недакладнасці, якія неабходна выправіць.

Намеснік старшыні Чырвонаармейскай участковай выбарчай камісіі тав. Рабцевіч гаворыць у сваім выступленні, што члены камісій вывучылі выбарчы закон, а таксама вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю. Участак афармлен, устаноўлены дзяжурствы. Але ўсё-ж агітацыйна-масавая работа сярод выбаршчыкаў разгорнута слаба. Аб гэтым сведчыць хаця-б той факт, што на сход выбаршчыкаў, які быў склікан 10 лістапада, сабралася ўсяго 78 чалавек.

Тав. Сімановіч—старшыня Валынскай участковай выбарчай камісіі,— расказаў як разгорнута агітацыйна-масавая работа на выбарчым участку.

— У нас на ўчастку, — гаворыць ён,—у які ўваходзяць прадмесці Валынка і Соя, арганізавана 10 гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. У кожнай акрузе створана па 2 гурткі. На працягу апошніх двух тыдняў у гуртках праведзена па 2—3 заняткі.

Сярод выбаршчыкаў Менжынскага выбарчага ўчастка агітацыйна масавую работу праводзяць 40 агітатараў. Кожны агітатар прымацаван да двух дамоў.

Нарада паказала, што не на ўсіх участках разгорнута сапраўдная падрыхтоўка да выбараў. На асобных участках спісы выбаршчыкаў яшчэ не вывешаны. Такое, напрыклад, становішча на Орджанікідзеўскім участку. Вінаў гэтым, безумоўна, кладзецца на горвыканком, які да гэтага часу не забяспечыў заканчэння складання спісаў выбаршчыкаў. Спісы складаюцца яшчэ і зараз, не гледзячы на тое, што яны павінны былі быць вывешаны за 35 дзён да дня выбараў.

Нарада прайшла ў атмасферы дзелавітасці і адказнасці яе ўдзельнікаў за даручаную вялікую і важную работу. Усе ўдзельнікі нарады адчулі, што на выбарчых участках горада прадстаіць правесці вялікую работу па падрыхтоўцы да прадстаячых выбараў.

Ш. Фрыдман.

Незадавальняюча кіруюць агітацыйнай работай

Прайшоў месяц з пачатку выбарчай кампаніі. За гэты час ва ўсіх гарадах і сёлах заходніх абласцей разгарнулася шырокая масава-палітычная работа.

А вось у раённым центры Косава да гэтага часу не знаёмяць працоўных з выбарчым законам, з вялікімі правамі і абавязкамі грамадзян СССР, прадастаўленымі Сталінскай Канстытуцыяй. У гэтым горадзе агітатары, як правіла, не выступілі да работы.

Выклікае крайняе здзіўленне спакой, з якім за гэтым назірае райком партыі.

Трэба сказаць, што і агітацыйная работа на вёсцы знаходзіцца без належнага кіраўніцтва, таму яна ў радзе месц праходзіць без плана і сістэмы.

А маса агітатараў мае патрэбу ў сур'ёзнай дапамозе.

Час не церпіць. Неабходна неадкладна выправіць сур'ёзныя недахопы ў падрыхтоўцы да выбараў.

С. Мор.

Святкаванне ў Маскве XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Социялістычнай Рэволюцыі.
Часці войск Маскоўскага гарнізона перад парадам на Чырвонай плошчы. *Фота Д. Чэрнова.* *Фота ТАСО.*

Безадказныя адносіны да сур'ёзнай справы

На Леванеўскім выбарчым участку г. Бреста работа праводзіцца вельмі дрэнна. Акруговыя выбарчыя камісіі бяздзейнічаюць. Калі ні прыдзеш у памяшканні, адведзеныя для выбарчых камісій — там нікога не можна застаць. Пыталі ў суседзей, — і тыя нічога пра камісіі і пра надыходзячыя выбары не ведаюць.

У самым центры выбарчага ўчастка (у школе № 6) можна ўжо сустрэць людзей. Вывешаны спісы, крыху абсталяван пакой для наведвальнікаў, ёсць і людзі, якія жадаюць працаваць. Але сапраўднай масавай работы з насельніцтвам ніхто не праводзіць. Гутарак аб выбарах ніхто не наладжвае. Гурткі па вывучэнню Канстытуцыі і выбарчага закона не створаны.

Некаторую работу на ўчастку, праводзяць настаўнікі 6 школы, якія жывуць у іншых раёнах горада. Мясцовых актывістаў з выбаршчыкаў, якія жывуць і будуць выбіраць на гэтым участку, ніхто да работы не прыцягнуў.

Мы хадзілі па кватэрах. Усюды нас цёпла сустракалі. Пыталі калі будуць выбары, каго будуць яны выбіраць. Амётна людзі расказвалі нам аб сваёй рабоце, аб жыцці, аб вучобе дзяцей. Многа тут жыве рабочых-чыгуначнікаў, служачых совецкіх устаноў — людзі, якія вельмі жадаюць уключыцца ў грамадскую работу. І не іх віна, што іх энергія не скарыстоўваецца.

Дзе-ж партарганізацыя банка, якой даручана весці работу на гэтым участку? Дзе старшыні і члены выбарчых камісій, якіх калектывы прадпрыемстваў выбіралі і даручылі ім такую пачесную работу?

З насельніцтвам Леванеўскага участка нам лёгка ўдалося пазнаёміцца. Але не маглі мы знайсці старшынь акруговых камісій, каб задаць ім нашы пытанні і перадаць ім патрабаванні грамадскасці і скаргі выбаршчыкаў. Мы гэта робім праз газету.

Брыгада рабкораў
газеты „ЗАРА":
І. Спектар,
Г. Салавейчык.

Калі клуб стане сапраўдным ачагом культуры

З кожным днём узрастае пага да ведаў і культуры Моладзь, бацькі і маперы сем'яў ідуць вучыцца ў школы, наведваюць кіно, з'яўляюцца актыўнымі наведвальнікамі бібліятэк, з вялікім інтарэсам слухаюць гутаркі агітатараў на розныя тэмы. Але не ўсе магчымасці ў гэтым напрамку яшчэ выкарыстаны.

У горадзе Косава ёсць, напрыклад, вельмі добры клуб. За ўвесь час свайго існавання клубнае памяшканне выкарыстоўваецца толькі як кіно-зал. Клуб не стаў центрам культурна-масавай работы і разгортвання мастацкай самадзейнасці. Не праводзяцца тут лекцыі і даклады на палітычныя, літаратурныя, анты-рэлігійныя і іншыя тэмы, хоць у Косаве ёсць вялікі атрад інтэлігенцыі.

У вольны час рабочым, служачым, вучням няма куды пайсці, каб культурна і карысна адпачыць. У клубе не арганізоўваюцца вечары мастацкай самадзейнасці, ды і самадзейных гурткоў у Косаве няма. Загадчык клубам Вальфсон не праяўляе ніякай ініцыятывы ў разгортванні масавай работы. А з наступленнем зімы гэта пытанне становіцца асабліва важным.

Дзверы клуба павінны быць шырока раскрыты для моладзі, рабочых, служачых і інтэлігенцыі. Лекцыі, самадзейныя выступленні, гурткоўая работа павінны стаць пастаяннай і невыпадковай з'явай у клубе раённага центра.

М. Пазняк,
выкладчык Косаўскай
сярэдняй школы.

Поўны супакой

На прадпрыемствах, у калгасах, МТС і ўстановах Жабінкаўскага раёна працуе многа моладзі дапрызыўнага ўзросту.

Яны гараць жаданнем вывучаць ваенную справу, гатовіць з сябе палітычна-граматных і ўсебакова адукаваных воінаў Чырвонай Арміі. Не лічацца з гэтым законным жаданнем у нашым раёне. Абаронныя арганізацыі: раённы Совет Асавіяхіма (старшыня Дармота), раённы камітэт фізкультуры (старшыня Сімяранка) і раённы камітэт Чырвонага крыжу (старшыня Буглакова) стаяць у баку ад работы з дапрызыўнікамі. Як факт, ні ў адным сельсавеце раёна не работаюць абаронныя гурткі, не рыхтуюцца з дапрызыўнікаў значкісты ВС, ГПА, ППХА і ГСА. Такое-ж становішча і ў цэнтры раёна—Жабінцы.

У баку ад важнейшай справы —работы з дапрызыўнікамі—стаіць і раённы камітэт комсамола. Члены бюро яго напэўна не разумеюць сваёй ролі ў падрыхтоўцы да прызыва. А гэту ролю трэба было зразумець, бо ў раёне, не кажучы аб несавучай моладзі, 87 комсамольцаў, якія будуць прызывацца ў Чырвоную Армію ў 1941 годзе.

Не кіруе падрыхтоўкай да прызыва і ваенны аддзел раённага камітэта партыі.

Бакунчык.

Будуем пажарны хлеў

Сяляне вёскі Нарутовічы, Баравоўскага раёна, рашылі пабудаваць сваімі сіламі і сродкамі пажарны хлеў. 1 лістапада распачата будаўніцтва. За 6 дзён зроблен зруб. Зараз ідзе астатняя будаўнічая работа, якая будзе закончана ў бліжэйшыя дні.

Будаўніцтва ўзначальваюць член сельсовета тав. Русін М. В. і актывіст тав. Тарасевіч А. М.

І. С. Скробат,
старшыня Нарутовіцкага
сельсовета.

На нарадзе загадчыкаў райза

19 лістапада пры Брэсцкім абласным земельным аддзеле адбылася абласная нарада загадчыкаў райза. Абмеркавана два важных пытанні калгаснага будаўніцтва: вынікі сельскагаспадарчых работ за 1940 год і падрыхтоўка да зімоўкі калгаснай жывёлы. Па першаму і другому пытанням дакладвалі загадчыкі райза і спецыялісты абласнога земельнага аддзела.

Першы год новага жыцця вызваленага сялянства азнаменаваўся арганізацыяй калгасаў, масавым уступленнем у калгасы аднаасобных гаспадарак. За бягучы гаспадарчы год арганізавана ў вобласці больш 70 калгасаў. Калектыўная праца і машынная тэхніка па апрацоўцы зямлі забяспечылі высокі сталінскі ўраджай калгасам, багаты працадзень калгаснікам. У сярэднім калгасы вобласці сабралі па 13—14 центнераў зернавых і каля 200 центнераў бульбы з гектара.

Своечасовая і арганізаваная веснавая пасеўная кампанія з'явілася таксама залогам у атрыманні багатага ўраджаю.

Аднак, у радзе калгасаў не гаспадарскі адносіліся да своечасовага абмалоту і захавання багатага ўраджаю.

Кой-дзе быў дапушчан разрыў паміж уборкай і абмалотам зернавых. У адным толькі калгасе „Пабеда", Высокаўскага раёна, ляжыць неабмалочаны хлеб з 60 гектараў.

Не закончылі малацьбу і калгасы Брэсцкага раёна. Загадчык райза тав. Каравін і кіраўнікі МТС не арганізавалі тут работу трактарных і конных малацілак. У калгасе імені Сталіна, Ружанскага раёна, ураджай з 100 гектараў ляжыць у снапах пад адкрытым небам.

Зацяжка абмалоту хлябоў затрымлівае і разлік калгасаў з дзяржавай. За выкананыя работы МТС калгасы яшчэ не дадалі дзяржаве 94 тоны натураплаты.

Блізак канец гаспадарчага года. Калгаснікі чакаюць размеркавання ўраджаю, шчодрай платы за працадзень. Але трэба сказаць праўду, што ў некаторых калгасах дрэнна рыхтуюцца да размеркавання прыбытку. Да апошняга дня не наведзен большэвіцкі парадак ва ўліку працадзён, балансіраванні гадавых прыходаў. Не засыпаны насенныя, страхавыя і другія фонды, без чаго ніяк нельга распачынаць размеркаванне.

Бухгалтары-кантралёры і статыстыкі райза не зблізіліся з калгаснымі рахункаводамі і ўчотчыкамі, што прывяло ў некаторых калгасах да прамога парушэння статута сельгасарцелі. Напрыклад, у калгасе імені Сталіна, Косаўскага раёна, за жнівень месяц яшчэ не ўпісаны працадні ў працоўныя кніжкі.

Пры ўдзеле сакратара абкома партыі тав. Дружыніна нарада шырока абмеркавала пытанне падрыхтоўкі да зімы калгаснай жывёлы.

Выяўлена, што загадчыкі райза, старшыні і ўчастковыя зоатэхнікі не зрабілі для сябе патрэбных высноў з апошніх рашэнняў партыі і ўрада аб развіцці грамадскай жывёлагадоўлі.

Наглядная непадрыхтаванасць да зімы відна ў калгасах Антопальскага раёна і асабліва ў калгасе імені VI Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. Памяшканні для стойла жывёлы тут знаходзяцца ў поўнай непрыгоднасці. Няма ні аднаго станка, кармушак. Грубы кармы скарыстоўваюцца бескантрольна. Стагі сена на калгасным дворе не агароджаны, з-за чаго жывёла без ніякіх перашкод з'ядае каштоўны зімні корм.

Вельмі зацягнута планавае будаўніцтва жывёльных памяшканняў. У калгасе імені Калініна, Брэсцкага раёна, толькі на 50 процантаў закончаны будаўнічыя работы кароўніка і канюшні. Няма дзе ставіць на зіму авечак у калгасе імені Чырвонай Арміі, Жабінкаўскага раёна, а будаўніцтва аўчарніка спынена. У калгасах імені Молатава і „Першае Мая", Пружанскага раёна, новыя будоўлі зданы ў эксплаатацыю без прыёмнай камісіі, незакончанымі, без падлогі, столі і ўнутранага абсталявання.

Поўнае забаванне і правучы рост жывёлы, маладняка будзе залежыць галоўным чынам ад багатага і поўнацэннага кармавога рацыёна. Старшыні калгасаў, зоатэхнікі і загадчыкі ферм павінны ўсямерна змагацца за правільнае саставленне кармовых норм, гаспадарчае расходаванне кармавога баланса. Не дапускаць з восені кармлення „на вока", без норм.

У калгасе імені Варашылава, Камянецкага раёна, ужо дапусцілі расцягванне кармоў, яравая салома і мякіна не ўзяты на ўлік, ляжаць на дворе. Безадказна адносіліся да захавання кармоў і ў калгасе „Першае Мая", Пружанскага раёна. Каштоўны корм — грэцкая мякіна пасля абмалоту грэчкі не звезена пад навець, згноена асеннімі дажджамі.

Вялікае значэнне ў зімні перыяд мае правільная арганізацыя працы на фермах. Нельга дапускаць абязлічкі пры доглядзе за жывёлай, як гэта мела месца ў калгасе „Камінтэрн", Косаўскага раёна, дзе кароў даглядалі па чарзе.

У сваім выступленні сакратар абкома партыі тав. Дружыніна прызваў усіх загадчыкаў земельных аддзелаў звярнуць зараз самую сур'ёзную ўвагу на падрыхтоўку да зімняга ўтрымання жывёлы, на ўмацаванне працоўнай дысцыпліны ў калгасах.

А. Літвін.

Па слядах неапублікаваных пісем

Калгаснікі сельгасарцелі імені Чырвонай Арміі, Жабінкаўскага раёна, Сарока і Крывушка прыслалі ў рэдакцыю пісьмо аб тым, што аграном МТС Данілава бяздзейнічае, не праводзіць сярод калгаснікаў занятак па агравучобе.

Жабінкаўскі РВК паведаміў рэдакцыі, што ўказаныя ў пісьме факты пацвердзіліся. Аграном МТС Данілава ад работы аслабанёна. У гэты калгас для чыткі лекцый па агратэхніцы накіраван старшы аграном райза.

У ДАПАМОГУ ВЫВУЧАЮЧЫМ ГІСТОРЫЮ ВКП(б)

Новая эканамічная палітыка і яе ажыццяўленне*)

IV.

У рэзультаце паспяховага заканчэння першай пяцігодкі ў краіне быў закладзен фундамент социялістычнай эканомікі.

У рэзультаце ажыццяўлення другога пяцігадовага плана быў пабудаван у асноўным социялізм—першая (або нізшая) фаза комуністычнага грамадства. Краіна ўступіла ў новую паласу развіцця, у паласу завяршэння будаўніцтва бяскласавага социялістычнага грамадства і паступовага пераходу ад социялізма да комунізма.

У сучасны момант задачы, якія ставіцца была вырашыць новая эканамічная палітыка, у асноўным выкананы.

У дакладзе аб праекце новай Канстытуцыі СССР таварыш Сталін ахарактарызаваў два перыяды развіцця новай эканамічнай палітыкі.

„Што мелі мы ў 1924 годзе?

Гэта,—гаварыў таварыш Сталін — перш перыяд непа, калі Совецкая ўлада дапусціла некаторае ажыўленне капіталізма пры мерным развіцці социялізма, калі яна разлічвала на тое, каб у ходзе спаборніцтва двух сістэм гаспадаркі капіталістычнай і социялістычнай, арганізаваць перавагу социялістычнай сістэмы над капіталістычнай. Задача саставала ў тым, каб у ходзе гэтага спаборніцтва ўмацаваць пазіцыі социялізма, дабіцца ліквідацыі капіталістычных элементаў і завяршыць перамогу социялістычнай сістэмы, як асноўнай сістэмы народнай гаспадаркі" („Пытанні ленінізма", стар. 508, 11-е выд.)

У 1924 годзе прамысловасць была слабай, яна яшчэ не мела новай тэхнікі. Каля 20 проц. прамысловасці знаходзілася ў руках капіталістычнага сектара. У сельскай гаспадарцы пераважала дробная таварная сялянская гаспадарка. Калгасы і саўгасы былі слабыя і ў эканоміцы сельскай гаспадаркі не адыгрывалі колькі-небудзь заметнай ролі. У таварабароце ўдзельная вага прыватнага капітала складала прыкладна 40—50 процантаў.

За перыяд, які прайшоў ад 1924 да 1936 года, у эканоміцы нашай краіны адбылося глыбокія зрухі. Эканоміка змянілася карэнным чынам, яна стала социялістычнай. Многаўкладнасць эканомікі была ліквідавана. Былі ліквідаваны эксплаататарскія класы. Рабочы клас і сялянства перацярпелі глыбокія змены, сталі новымі, дружаственнымі класамі; грані паміж якімі падаюць і сціраюцца.

Калі раней наша дзяржаўная прамысловасць развівалася на социялістычнай аснове, знішчаючай капіталізм, а сельская гаспадарка развівалася на дробна таварнай аснове, нараджаючай капіталізм, то зараз і прамысловасць і сельская гаспадарка базіруюцца на аднатыпнай, социялістычнай аснове, выключаючай рост капіталізма.

Характарызуючы гэтую абстаноўку, таварыш Сталін гаварыў:

„Што мы маем зараз, у 1936 годзе?

Калі мы мелі тады першы перыяд непа, пачатак непа, перыяд некаторага ажыўлення капіталізма, то мы маем цяпер апошні перыяд непа, канец непа, перыяд поўнай ліквідацыі капіталізма ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі" (там-жа, стар. 509)

Са змяненнем эканомікі і класавых сіл у краіне павінна была змяніцца і палітыка партыі. Новы ўзровень развіцця, новыя задачы патрабуюць новай палітыкі. Неп у асноўным вычарпаў сябе.

У сваёй прамове „Да пытанняў аграрнай палітыкі ў СССР" таварыш Сталін гаварыў:

„...Калі мы прытрымліваемся непа, то таму, што ён [illegible] служыць справе социялізма. А [illegible] перастане служыць [illegible] пыялізма, мы яго адкінем к чорту. Ленін гаварыў, што неп уведзен усур'ёз і надоўга. Але ён ніколі не гаварыў, што неп уведзен назаўсёды" („Пытанні ленінізма", стар. 293 — 294. 11-е выд.).

У сучасны момант гутарка можа ісці не аб непе, а толькі аб рэштках непа, якія не з'яўляюцца характэрнымі для сучаснай гаспадарчай палітыкі совецкай дзяржавы, не вызначаюць яе сутнасці.

Рэшткі непа захоўваюць сваю сілу настолькі, наколькі ў нашай краіне захоўваюцца яшчэ аднаасобнікі і некааперыраваныя саматужнікі і рамеснікі. Але іх удзельная вага ў эканоміцы настолькі малая, што яны не могуць адыгрываць заметнай ролі ў нашым развіцці.

V

Некаторыя нашы таварышы лічаць, што неп захаваецца аж да комунізма. Яны апраўдваюць свой пункт гледжання наяўнасцю ў нашай краіне гандлю, грошай, гаспадарчага разліку, кантроля рублём. Такі погляд няправільны.

Неп немыслімы без гандлю, грошай, гаспадарчага разліку. Аднак з гэтага зусім не вынікае, што неп павінен страціць сваё значэнне толькі тады, калі згіне гандаль, згінуць грошы [illegible] пам. Неп разлічан быў на такі гандаль, у якім прымалі ўдзел дзяржаўныя, кааператыўныя, прыватныя капіталістычныя элементы і дробнатаварныя элементы горада і вёскі. У гандлі ў перыяд непа ішла барацьба паміж социялістычнымі і капіталістычнымі элементамі, якая закончылася перамогай социялістычных элементаў.

Зараз у нас таксама ёсць гандаль, але ён па свайму зместу карэнным чынам адрозніваецца ад ранейшага гандлю. Мы маем зараз разгорнуты совецкі гандаль без капіталістаў, вялікіх і малых. Такога роду гандаль мы будзем усебакова развіваць да таго часу, пакуль не будуць падрыхтаваны ўмовы для пераходу да прамога прадуктаабмену, пакуль не будуць падрыхтаваны эканамічныя і арганізацыйныя прадпасылкі для пераходу да комуністычнага прынцыпа вытворчасці і размеркавання.

Паколькі ў нашай краіне ў даны момант пануе прынцып социялізма — „ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму па яго працы", мы не можам абыйсціся без разгорнутага совецкага гандлю. [illegible] не магчыма без грошай [illegible] і грошы будуць [illegible] вышэйшай [illegible] грамадства. [illegible] Усебаковага [illegible] працы і мерай [illegible] кантроль [illegible]

практыка не дала нам другога сродка для ажыццяўлення гэтага кантролю. Совецкія грошы адыгрывалі велізарную ролю на розных этапах социялістычнага будаўніцтва. Іх роля мянялася пры пераходзе ад аднаго этапа социялістычнага будаўніцтва да другога. У свой час нашы грошы з'яўляліся ў руках дыктатуры пролетарыята сродкам барацьбы супроць капіталістычных элементаў. У сучасны момант гэтая роля грошай зведзена к нулю, бо ў краіне не толькі знішчаны капіталістычныя элементы, але і прычыны, іх нараджаючыя. Але грошы яшчэ адыгрываюць вялікую ролю ў барацьбе супроць усякага роду спекулянтаў, у барацьбе супроць лодыраў, летуноў, прагульшчыкаў.

Нашы грошы іграюць вялікую ролю і ў барацьбе за выхаванне социялістычнай дысцыпліны працы, за павышэнне прадукцыйнасці працы, за памнажэнне народнага багацця. Грошы з'яўляюцца сродкам кантролю над мерай працы і спажывання, сродкам кантролю за ажыццяўленнем прынцыпа социялізма.

Мы ажыццяўляем строгі гаспадарчы разлік. Наша планавая гаспадарка не можа без яго абыйсціся. Але гаспадарчы разлік, як і гандаль, немагчым без грошай.

Такім чынам, гандаль, грошы, гаспадарчы разлік будуць яшчэ доўга існаваць, у той час як неп асноўным вычарпаў сябе.

*) Працяг, пачатак гл. у № ад лістапада.

Аб аплаце старшынь калгасаў, аб заахвочванні звенняў і брыгадзіраў паляводчых брыгад за павышэнне ўраджайнасці

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі

У мэтах далейшага ўздыму ўраджайнасці і ўмацавання грамадскай калгаснай гаспадаркі, Совет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі пастанаўляюць:

Устанавіць наступны парадак і размер аплаты старшынь калгасаў, заахвочвання звенняў і брыгадзіраў паляводчых брыгад за павышэнне ўраджайнасці:

1. Налічаць старшыням калгасаў працадні за кожны месяц работы ў наступных размерах:

пры пасеўнай плошчы ў калгасе (уключаючы агароды, сады і агароднікі) да 100 гектараў — 45 працадзён;

ад 101 гектара да 300 гектараў — 50 працадзён;
ад 301 да 500 гектараў — 55 працадзён;
ад 501 да 700 гектараў — 60 працадзён;
ад 701 да 1.000 гектараў — 70 працадзён;
ад 1.001 да 1.500 гектараў — 80 працадзён;
звыш 1.500 гектараў — 90 працадзён у месяц.

2. Выдаваць старшыням калгасаў штомесячна грашовую аплату ў размерах:

пры агульнай суме грашовых даходаў калгаса ў год

да 10 тысяч рублёў	25 руб.
ад 10 да 25 тыс. руб.	50 руб.
ад 25 да 50 тыс. руб.	75 руб.
ад 50 да 100 тыс. руб.	125 руб.
ад 100 тыс. руб. да 200 тыс. руб.	150 руб.
ад 200 тыс. руб. да 300 тыс. руб.	175 руб.
ад 300 тыс. руб. да 400 тыс. руб.	200 руб.
ад 400 тыс. руб. да 500 тыс. руб.	225 руб.
ад 500 тыс. руб. да 600 тыс. руб.	250 руб.
ад 600 тыс. руб. да 700 тыс. руб.	275 руб.
ад 700 тыс. руб. да 800 тыс. руб.	300 руб.
ад 800 тыс. руб. да 900 тыс. руб.	325 руб.
ад 900 тыс. руб. да 1.000 тыс. руб.	350 руб.
ад 1.000 тыс. руб. і вышей.	400 руб. у месяц.

3. Да выканання канчатковай сумы грашовага даходу размер даплаты старшыням калгасаў устанавіць, выходзячы з сумы грашовага даходу за мінулы год.

Штомесячна старшыням калгасаў выплачваць 70 проц. ад устаноўленай даплаты. Канчатковы разлік з старшынямі калгасаў праводзіцца ў канцы года пасля зацвярджэння гадавой справаздачы агульным сходам калгаснікаў і разгляду гадавой справаздачы калгасаў прэзідыумам раённага выканкома Совета дэпутатаў працоўных.

4. Прапанаваць калгасам налічаць дадаткова працадні ў залежнасці ад стажа работы старшыням калгасаў, працуючым у калгасе трэці год, у размеры — 5 проц., чацвёрты год — у размеры — 10 проц., працуючым 5 год і больш — 15 проц. да ўстаноўленай штомесячнай аплаты ў працаднях.

5. Прапанаваць калгасам увесці дадатковае налічэнне працадзён калгаснікам, працуючым у звенях калгасных брыгад або ў брыгадах, за кожны атрыманы ў іх звяне або брыгадзе, звыш устаноўленага плана ўраджайнасці, гадзіраў паляводчых брыгад за павышэнне ўраджайнасці:

1. Налічаць старшыням калгасаў працадні за кожны месяц работы ў наступных размерах:

пры пасеўнай плошчы ў калгасе (уключаючы агароды, сады і агароднікі) да 100 гектараў — 45 працадзён;

ад 101 гектара да 300 гектараў — 50 працадзён;
ад 301 да 500 гектараў — 55 працадзён;
ад 501 да 700 гектараў — 60 працадзён;
ад 701 да 1.000 гектараў — 70 працадзён;
ад 1.001 да 1.500 гектараў — 80 працадзён;
звыш 1.500 гектараў — 90 працадзён у месяц.

2. Выдаваць старшыням калгасаў штомесячна грашовую аплату ў размерах:

пры агульнай суме грашовых даходаў калгаса ў год

да 10 тысяч рублёў	25 руб.
ад 10 да 25 тыс. руб.	50 руб.
ад 25 да 50 тыс. руб.	75 руб.
ад 50 да 100 тыс. руб.	125 руб.
ад 100 тыс. руб. да 200 тыс. руб.	150 руб.
ад 200 тыс. руб. да 300 тыс. руб.	175 руб.
ад 300 тыс. руб. да 400 тыс. руб.	200 руб.
ад 400 тыс. руб. да 500 тыс. руб.	225 руб.
ад 500 тыс. руб. да 600 тыс. руб.	250 руб.
ад 600 тыс. руб. да 700 тыс. руб.	275 руб.
ад 700 тыс. руб. да 800 тыс. руб.	300 руб.
ад 800 тыс. руб. да 900 тыс. руб.	325 руб.
ад 900 тыс. руб. да 1.000 тыс. руб.	350 руб.
ад 1.000 тыс. руб. і вышей.	400 руб. у месяц.

3. Да выканання канчатковай сумы грашовага даходу размер даплаты старшыням калгасаў устанавіць, выходзячы з сумы грашовага даходу за мінулы год.

Штомесячна старшыням калгасаў выплачваць 70 проц. ад устаноўленай даплаты. Канчатковы разлік з старшынямі калгасаў праводзіцца ў канцы года пасля зацвярджэння гадавой справаздачы агульным сходам калгаснікаў і разгляду гадавой справаздачы калгасаў прэзідыумам раённага выканкома Совета дэпутатаў працоўных.

4. Прапанаваць калгасам налічаць дадаткова працадні ў залежнасці ад стажа работы старшыням калгасаў, працуючым у калгасе трэці год, у размеры — 5 проц., чацвёрты год — у размеры — 10 проц., працуючым 5 год і больш — 15 проц. да ўстаноўленай штомесячнай аплаты ў працаднях.

5. Прапанаваць калгасам увесці дадатковае налічэнне працадзён калгаснікам, працуючым у звенях калгасных брыгад або ў брыгадах, за кожны атрыманы ў іх звяне або брыгадзе, звыш устаноўленага плана ўраджайнасці, пэнтнер зернавых і зярно-бабовых культур — 2—3 працадні.

Працадні, налічаныя дадаткова за перавыкананне плана ўраджайнасці, размяркоўваць паміж членамі звяна або брыгады ў адпаведнасці з агульнай колькасцю працадзён, выпрацаваных кожным з іх.

6. Кіраўніку звяна звыш таго налічаць працадні дадаткова за кіраўніцтва звяном у размеры 2—3 проц. ад агульнай колькасці працадзён, выпрацаваных усім звяном.

7. У мэтах заахвочвання брыгадзіраў калгасаў у павышэнні ўраджайнасці, прапанаваць калгасам звыш устаноўленай пастаяннай аплаты налічаць у канцы года премію брыгадзіру паляводчай брыгады пры перавыкананні плана ўраджайнасці брыгады па асноўных культурах да 10 проц. у размеры 50—60 працадзён; пры перавыкананні плана ўраджайнасці ад 10 да 20 проц. — 75—90 працадзён і пры перавыкананні плана ўраджайнасці на 20 проц і вышей — у размеры 100—120 працадзён.

8. Гэту пастанову ўвесці ў дзеянне з 1 лістапада 1940 года.

Старшыня СНК БССР І. БЫЛІНСКІ.

Сакратар ЦК КП(б) Беларусі П. ПАНАМАРЭНКА.

КАНДЫДАТЫ У ДЭПУТАТЫ

Брэсцкага Абласнога Совета дэпутатаў працоўных, зарэгістраваныя акруговымі выбарчымі камісіямі па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных

Тамашэўская выбарчая акруга № 30

Шахметаў Сцяпан Кандрацьевіч, 1901 года нараджэння, член ВКП(б), сакратар Дамачэўскага РК КП(б)Б, вылучаны агульнымі сходамі рабочых і служачых шпалапрэтачнага завода і чыгуначнай станцыі Владава.

Жабінкаўская выбарчая акруга № 31

Коршук Канстанцін Фёдаравіч, 1907 года нараджэння, член ВКП(б), загадчык Брэсцкім абласным аддзелам народнай асветы, вылучаны агульнымі сходамі членаў профсаюза Жабінкаўскай НСШ і сялянамі вёскі Оцебрава, Жабінкаўскага раёна.

Сяхновіцкая выбарчая акруга № 32

Малошык Пётр Андрэевіч, 1890 года нараджэння, беспартыйны, старшыня калгаса імені 17 верасня, Жабінкаўскага раёна, вылучаны агульнымі сходамі калгаснікаў калгасаў імені 17 верасня і „Шлях сацыялізма".

Азяцкая выбарчая акруга № 33

Давыдаў Васілій Сцяпанавіч, 1908 года нараджэння, член ВКП(б), старшыня Жабінкаўскага райвыканкома, вылучаны агульнымі сходамі Жабінкаўскай раённай партыйнай арганізацыі і калгаснікамі калгаса імені Варашылава.

Камянецкая выбарчая акруга № 34

Красоўская Надзежда Іванаўна, 1910 года нараджэння, беспартыйная, настаўніца Навіцкавіцкай школы, Камянецкага раёна, вылучаная агульным сходам сялян вёскі Замосты, Камянецкага раёна.

Дамітравіцкая выбарчая акруга № 35

Радзюк Трафім Сямёнавіч, 1906 года нараджэння, член ВКП(б), сакратар Камянецкага РК КП(б)Б, вылучаны агульнымі сходамі сялян вёсак Ходасы і Дворцы, Дамітравіцкага сельсовета, Камянецкага раёна.

Ратайчыцкая выбарчая акруга № 36

Валчкоў Сяргей Васільевіч, 1904 года нараджэння, член ВКП(б), сакратар Брэсцкага аблвыканкома, вылучаны сходамі сялян вёсак Ратайчыцы, Жылічы, Рабанка, Камянецкага раёна.

Кляшчэльская выбарчая акруга № 37

Рудзяк Федосій Маркавіч, 1904 года нараджэння, член ВКП(б), сакратар Кляшчэльскага РК КП(б)Б, вылучаны агульным сходам грамадзян гарадскога пасёлка Кляшчелі.

Мілейчыцкая выбарчая акруга № 38

Саўчынскі Нікіфар Данілавіч, 1889 года нараджэння, беспартыйны, селянін, вылучаны агульнымі сходамі сялян вёсак Белкі і Мілейчыцы Кляшчэльскага раёна.

Тавельская выбарчая акруга № 39

Федасюк Аляксандра Іванаўна, 1904 года нараджэння, беспартыйная, старшыня Кобрынскага горвыканкома, вылучаная агульным сходам сялян вёскі Таўлі, Тавельскага сельсовета, Кобрынскага раёна.

Ерэміцкая выбарчая акруга № 40

Карэлёў Нікалай Сяргеевіч, 1890 года нараджэння, член ВКП(б), начальнік Брэсцкага аблземаддзела, вылучаны агульным сходам сялян вёскі Ерэмічы, Ерэміцкага сельсовета, Брэсцкага раёна.

Пролетарская выбарчая акруга № 41

Ражкоў Сяргей Сяргеевіч, 1898 года нараджэння, член ВКП(б), вылучаны рабочымі і служачымі Кобрынскага чыгуначнага вузла.

Першамайская выбарчая акруга № 42.

Давідзюк Рахіль Сямёнаўна, 1912 года нараджэння, беспартыйная, краўчыха Кобрынскай арцелі „Сацыялістычная праца", вылучаная членамі швейнай арцелі „Сацыялістычная праца" гор. Кобрына.

Косаўская гарадская выбарчая акруга № 43.

Грудзёў Раман Нікіціч, 1898 года нараджэння, член ВКП(б), намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкома, вылучаны агульным сходам рабочых і служачых Косаўскага леспрамгаса.

Косаўская сельская выбарчая акруга № 44

Суханосік Еўдакія Іванаўна, 1905 года нараджэння, беспартыйная, калгасніца калгаса імені Варашылава, вылучаная агульным сходам калгаснікаў калгаса імені Варашылава, Косаўскага раёна.

Івацэвіцкая пасялковая выбарчая акруга № 45

Талочка Канстанцін Дзем'янавіч, 1903 года нараджэння, беспартыйны, старшыня Івацэвіцкага пасялковага совета, вылучаны агульным сходам рабочых і служачых Івацэвіцкага лесазавода № 18.

Маларыцкая выбарчая акруга № 46.

Амілаў Пракофій Ігнацьевіч, 1895 года нараджэння, член ВКП(б), пракурор Брэсцкай вобласці, вылучаны агульнымі сходамі сялян, Ляхавецкага, Гвазніцкага і Збуражскага сельсоветаў, Маларыцкага раёна.

Вялікарыцкая выбарчая акруга № 47

Рудзюк Аляксандра Ульянаўна, 1919 года нараджэння, беспартыйная, сялянка, вылучаная агульнымі сходамі рабочых і служачых Маларыцкай МТС і сялян Макранскага, Вялікарыцкага, Масевіцкага і Лукаўскага сельсоветаў, Маларыцкага раёна.

Олтушская выбарчая акруга № 48

Латышаў Сямён Грыгор'евіч, 1897 года нараджэння, член ВКП(б), старшыня Маларыцкага райвыканкома, вылучаны агульнымі сходамі сялян Олтушскага, Радзежскага, Хаціслаўскага і Арэхаўскага сельсовета, Маларыцкага раёна.

Поразаўская выбарчая акруга № 49

Багаценка Іван Васільевіч, 1903 года нараджэння, член ВКП(б), начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення міліцыі, вылучаны агульным сходам сялян сяла Поразава.

Лаўрыновіцкая выбарчая акруга № 50

Фунт Марыя Фамінічна, 1922 года нараджэння, член ЛКСМБ, калгасніца калгаса „Чырвоны Оцяг", Поразаўскага раёна, вылучаная агульным сходам калгаснікаў калгаса „Чырвоны оцяг", Поразаўскага раёна.

Нізняняская выбарчая акруга № 51

Кацнельсон Лазар Бенцыянавіч, 1903 года нараджэння, член ВКП(б), сакратар Поразаўскага РК КП(б)Б, вылучаны агульным сходам сялян вёскі Нізняны, Нізняняскага сельсовета, Поразаўскага раёна.

Пружанская гарадская выбарчая акруга № 52

Шэлман Тамхель Пелетавіч, 1905 года нараджэння, член ВКП(б), загадчык Брэсцкага абласнога фінансавага аддзела, вылучаны агульным сходам членаў профсаюза дзяржаўных медыцынскіх устаноў гор. Пружаны.

Пружанская сельская выбарчая акруга № 53

Шышкін Аляксандр Пятровіч, 1905 года нараджэння, член ВКП(б), упаўнаважаны раённага аддзялення НКУС Пружанскага раёна, вылучаны агульным сходам калгаснікаў калгаса „Большэвік" Параслянскага сельсовета, Пружанскага раёна.

Ліноўская выбарчая акруга № 54

Чарнуха Сцяпан Ільіч, 1909 года нараджэння, беспартыйны, старшыня Ліноўскага сельсовета Пружанскага раёна, вылучаны агульным сходам сялян вёскі Ліново, Ліноўскага сельсовета, Пружанскага раёна.

Малецкая выбарчая акруга № 55

Жукоўскі Антон Сямёнавіч, 1898 года нараджэння, член ВКП(б), старшыня Пружанскага райвыканкома, вылучаны агульным сходам сялян вёскі Малеч, Малецкага сельсовета, Пружанскага раёна.

Хоразўская выбарчая акруга № 56

Босак Анна Фамінічна, 1902 года нараджэння, беспартыйная, сялянка вёскі Ражкавічы, Рудніцкага сельсовета, Пружанскага раёна, вылучаная агульным сходам сялян вёскі Хорева, Хоразўскага сельсовета, Пружанскага раёна.

Ружанская выбарчая акруга № 57

Сяргеў Аляксандр Андрэевіч, 1905 года нараджэння, член ВКП(б), начальнік упраўлення НКУС па Брэсцкай вобласці, вылучаны агульным сходам рабочых і служачых Ружанскага райпромкамбіната.

Славяніцкая выбарчая акруга № 59

Каралёў Аляксей Васільевіч, 1909 года нараджэння, член ВКП(б), старшыня Ружанскага райвыканкома, вылучан агульным сходам калгаснікаў калгаса імені Варашылава, Кавальскага сельсовета, Ружанскага раёна.

Драгічынская выбарчая акруга № 62.

Ячменёў Георгій Фокавіч, 1904 года нараджэння, член ВКП(б), старшыня Сямяніцкага райвыканкома, вылучаны агульнымі сходамі сялян вёсак Олохі, Олохінскага сельсовета, Кутковічы Надольныя, Кутковіцкага сельсовета, і грамадзянамі мястэчка Драгічын, Драгічынскага сельсовета, Сямяніцкага раёна.

Старшыня абласной выбарчай камісіі МАКЕЕНКА.

Мінская школа фабрычна-заводскага вучнёўства друкароў за 19 год існавання падрыхтавала сотні кваліфікаваных рабочых для паліграфічнай прамысловасці. Інструктар лінатыпнага цэха М. І. Жылінскі сочыць за работай на лінатыпе выдатніцы вучобы О. П. Гутнік.

Фота А. Панькова.

Фотахроніка Белта.

Дзейсна рыхтаваць рамесленыя вучылішчы да навучальнага года

У адпаведнасці з пастановай СНК БССР у горадзе Брэсце арганізаваны два рамесленыя вучылішчы, у якіх з 1 снежня будзе навучацца 600 чалавек моладзі.

Рамесленае вучылішча № 7 арганізаванае на базе рамонтна-механічных майстэрняў будзе рыхтаваць 200 слесараў, 50 столяраў, 50 токараў і 50 кавалёў, а вучылішча № 8 — 100 столяраў, 25 токараў і 25 слесараў.

Дзейсна рыхтуецца да новага навучальнага года вучылішча № 7 (дырэктар тав. Яцкевіч). Сіламі рабочых майстэрань падрыхтавана 100 зубіл, будуюцца кузнечныя горны, устаноўлена 100 слесарных піскоў, загатоўлена 800 напільнікаў і 300 малаткоў. Без грашовых асігнаванняў, сваімі сіламі, дырэкцыя гэтага вучылішча арганізавала набыццё жалезных ложкаў, вучэбных сталоў, табурэтак

10 лістапада спецыяльнай камісіяй прынята вучэбнае памяшканне, а таксама пе[illegible]шкачне для сталовай і інтэрнату. Заканчваецца падбор выкладчыцкіх кадраў для вучылішча. Трэба адзначыць, што ў выніку непаваротлівасці гартопа вучылішча яшчэ зусім не мае паліва для атаплення памяшкання і для работы кузні. Вялікім тормазам у падрыхтоўцы вучылішча да навучальнага года з'яўляецца тое, што ў вучылішчы адсутнічае сталь для пригатаўлення дадатковай колькасці інструмента.

Дрэнна ідзе падрыхтоўка да навучальнага года ў рамесленым вучылішчы № 8.

Вельмі слаба займаюцца дапамогай вучылішчам комсамольскія арганізацыі. Зацверджаная пры ГК ЛКСМБ камісія па рабоце з навучаючайся моладдзю рамесленых вучылішч зрабіла вельмі мала, вельмі мала чаго зрабіў і ўцелым ГК ЛКСМБ. Не аказваецца дапамога вучылішчам у падборы высока-кваліфікаваных кадраў: майстраў, выхавацеляў, выкладчыкаў ваенна - фізкультурнай справы і іншых дысцыплін.

Следуе адзначыць факты несур'ёзных, больш таго, бюракратычных адносін з боку некаторых работнікаў горхарчпромгандлю да пытання забеспячэння рамесленых вучылішч неабходнымі таварамі. 12 лістапада намеснік начальніка горхарчпромгандлю тав. Вабаджан не жадаў нават і гутарыць па гэтаму пытанню з сакратаром ГК ЛКСМБ тав. Арцём'евым. Ён адказаў „забеспячэннем вучылішч вопратай, пасцельнымі прыладамі і іншымі таварамі мы не займаемся".

Наплывацельскі адносіцца да падрыхтоўкі школ фабрычна-заводскага абучэння да навучальнага года Гайнаўскі райвыканком. 29 кастрычніка на нараду для пасяджэння прэзідыума райвыканкома стаяла пытанне аб падрыхтоўцы гэтых школ да навучальнага года. Гэта пытанне па настаянню старшыні райвыканкома тав. Літвінка было знята з нараду дня.

12 лістапада на пасяджэнні бюро абкома комсамола слухалі даклад сакратара Брэсцкага ГК ЛКСМБ тав. Арцём'ева аб удзеле комсамольскіх арганізацый горада ў падрыхтоўцы рамесленых вучылішч да навучальнага года. Бюро ў сваім рашэнні адзначыла рад істотных недахопаў і намеціла мерапрыемствы ў галіне падрыхтоўкі рамесленых вучылішч і школ фабрычна-заводскага абучэння да навучальнага года.

С. М. Тэміна.

Прывесці ў парадак памяшканне паўстанка Паўловічы

(Пісьмо ў рэдакцыю)

Паміж станцыямі Бароза і Аранчыцы, Брэсцкай чыгункі, ёсць паўстанак Паўловічы. Памяшканне гэтага паўстанка горшчым хлеў. У ім няма ні адной скамейкі, ні крэсла, вечарам зусім цёмна. У зале чакання існуе паўнейшая антысанітарыя, шыбы павыбіты і праз іх дуе вецер.

Становішчам на паўстанку Паўловічы трэба заняцца ўпраўленню Брэсцкай дарогі.

С. Палейка.

VI.

Інакш абстаіць справа з новымі совецкімі рэспублікамі і абласцямі (заходнія вобласці Украіны і Беларусі, Бесарабія, Паўночная Букавіна, Латвія, Літва, Эстонія).

У гэтых рэспубліках і абласцях яшчэ ёсць многаўкладная эканоміка. Значыць, там яшчэ неабходны ў вядомай меры нэп. Але ўмовы, у якіх працякае развіццё новых совецкіх рэспублік і абласцей, накладваюць, зразумела, свае адбітак і на характар нэпа.

Па-першае, нэп у гэтых раёнах не можа працягвацца столькі, колькі ён працягваўся ў старых границах СССР. Народы новых рэспублік і абласцей пры дапамозе рэсурсаў усяго Совецкага Саюза, апіраючыся на яго вопыт, перамогуць сваю эканамічную адсталасць у больш кароткі тэрмін.

Па-другое, у новых совецкіх рэспубліках і абласцях пытанне „хто-каго" стаіць не так, як яно стаяла ў нас. Вядома, што там яшчэ існуюць капіталістычныя элементы ў эканоміцы, сельская гаспадарка прадстаўляе сабой пераважна аднаасобную дробную сялянскую гаспадарку і г. д. Аднак суадносіны сіл паміж капіталізмам і сацыялізмам вырашаюцца не ў межах новых рэспублік і абласцей, а ў маштабе ўсяго СССР. Там пераважае яшчэ дробнабуржуазны ўклад, але за ўсім СССР, роўнапраўнымі членамі якога новыя совецкія рэспублікі з'яўляюцца, ужо ажыццяўлёна ў асноўным першая фаза комунізма. Задача пабудовы сацыялістычных вытворчых адносін у новых рэспубліках і абласцях значна аблягчаецца тым, што яны апіраюцца на эканамічную магутнасць усяго Совецкага Саюза. У сілу гэтага тут праблема індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі будзе вырашана ў больш кароткі тэрмін.

Па-трэцяе, новыя совецкія рэспублікі ўвайшлі ў СССР у асноўным з неразбуранай гаспадаркай. Гэтае ва многім аблягчае рашэнне задач сацыялістычнага будаўніцтва ў новых раёнах СССР.

Калі ў нашай краіне ўстанавілася совецкая ўлада, прамысловасць была разбурана і не магла забяспечыць сельскую гаспадарку новай тэхнікай. Прайшло дзесяцігоддзе, раней чым прамысловасць пачала вырабляць і пасылаць у вёску трактары, камбайны і іншыя машыны. Новыя рэспублікі і абласці СССР атрымоўваюць трактары і камбайны ў першы-ж год існавання совецкай улады. Гэта не можа не паскорыць там будаўніцтва сацыялізма ў вёсцы. Старыя раёны СССР [illegible] мэтай тых [illegible] умоў [illegible] будаўніцтва сацыялізм[illegible] новыя раёны.

Усе гэтыя [illegible] трэба мець у віду і [illegible] пагласці і ха[illegible] эканамічнай палі[illegible] совецкіх рэспубліках [illegible].

Прадвыбарчы сход у калгасе імені Варашылава

Жабінка. (Па тэлефону). З вялікім уздымам прайшоў прадвыбарчы сход у калгасе імені Варашылава, Азяцкага сельсовета, на якім прысутнічала 147 чалавек. Першым узяў слова старшыня калгаса тав. Макарук М. С.

Выступленне старшыні калгаса М. С. Макарука

— Наш калгас падрыхтоўку да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных адзначае выдатнымі дасягненнямі. Мы паспяхова разлічыліся з дзяржавай па ўсіх відах паставак сельскагаспадарчых прадуктаў і па-ўдарнаму закончылі ўсе сельскагаспадарчыя работы. Калгас у першым годзе свайго жыцця дабіўся велізарных поспехаў.

Дзяржава за нашым калгасам замацавала на вечнае і бясплатнае карыстанне больш тысячы гектараў зямлі. Мы атрымалі ад сацыялістычнай дзяржавы 185 галоў буйнай рагатай жывёлы, 25 свіней, 30 коней і розныя сельскагаспадарчыя машыны. Калгаснікі заваявалі заможнае і культурнае жыццё. Калектыўная гаспадарка прынесла нам вялікія даходы. Толькі за рэалізацыю малочнай і мясной прадукцыі мы ў гэтым годзе атрымалі 20 тысяч рублёў прыбытку.

Чесная і добрасумленная праца калгаснікаў шчодра аплочана. Калгаснік Ефім Гажык авансам атрымаў на свае працадні 2154 кілограмы зернавых і 718 рублёў грашыма. Сем'я калгасніка Неспера Зазона атрымала зярна 2160 кілограмаў і грошай 720 рублёў. Былы батрак Іосіф Канюшок, які раней працаваў у памешчыка за кавалак хлеба, атрымаў авансам 2100 кілограмаў зернавых і 700 рублёў грашыма. Усе члены сельскагаспадарчай арцелі ўдоваль забяспечаны прадуктамі на цэлы год.

Заможнае і культурнае жыццё нам забяспечыў калгас. У арганізацыі калгаса вялікую дапамогу аказаў нам старшыня райвыканкома тав. Васілій Іванавіч Давыдаў. Я прапаную вылучыць яго кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

* * *

Затым выступілі калгаснікі тт. Каганоўскі, Гажык, Шыбыш, Павел Зазон, Софія Бычок, Юлія Андроховіч і іншыя — усяго 18 чалавек.

Сход калгаснікаў аднагалосна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета па Азяцкай выбарчай акрузе № 33 тав. Васілія Сцяпанавіча Давыдава; кандыдатам у раённы Совет старшыню калгаса тав. Майсея Сідаравіча Макарука і кандыдатамі ў Азяцкі сельсовет звеннявых калгаснікаў — Софію Ануфрыеўну Бычок і Анну Гаўрылаўну Лаўрынюк.

А. Фамічоў.

236

Коннаферма калгаса імені Карла Маркса (Днепрапятроўская обл.) вырашчвае выдатных коней для Чырвонай Арміі

Конюх П. Л. Кугай з вырашчаным ім 3-х гадовым жарабцом „Гам".

ПАДРЫХТАВАЛІ ДОБРУЮ ЗІМОЎКУ ЖЫВЁЛЕ

Партыя і ўрад надаюць вялікую ўвагу развіццю грамадскай жывёлагадоўлі. Пастанова ЦК ВКП(б) СНК СССР аб зменах у сістэме паставак мяса і шэрсці з'явіліся вялікім стымулам у развіцці калгаснай жывёлагадоўлі.

Наш калгас „Першае Мая" — малады. Арганізацыйна афармляцца і ўмацоўвацца ён распачаў толькі вясной гэтага года.

За прайшоўшы час у калгасе арганізаваны фермы: буйнай рагатай жывёлы на 38 галоў, аўцаводчая на 108 авечак, свінаферма на 34 свінні, отвараецца новая ферма — птушкаводная, ужо маецца 24 курыцы.

За праданае малако калгас атрымаў 15 тысяч рублёў чыстага прыбытку. У далейшым мы марнуем пашыраць фермы калгаса.

Да зімовага стойлавага перыяда калгаснікі распачалі рыхтаваць фермы з самай вясны. На Ўкраіне вёскі, на ўзгорку, за лета гэтага года вырасілі карпусы памяшканняў для жывёлы. Сіламі калгаснікаў пабудавана—два вялікіх кароўнікі, свінарнік, памяшканне для авечак, сушальная кухня для падрыхтоўкі корму жывёле, дзве кладавыя для хавання корму, дом для даглядчыкаў жывёлы. Усе будынкі агледжаны і ацеплены.

Поўнасцю ўкамплектаваны штаты работнікаў. Для работы на фермах калгаснікі вылучылі лепшых стахановаў калгаса: былую батрачку Зубко Сцепаніду, ударніцу Сідаровіч Ольгу, вопытных калгаснікаў Бондар Сцяпана і Крук Івана.

Многа ўвагі мы ўдзялілі стварэнню жывёле сытай зімоўкі. На ўвесь стойлавы перыяд загатоўлена дастатковая колькасць сакавітых і грубых кармоў. У сярэднім штодзённа на працягу ўсяго стойлавага перыяда на кожную карову будзем выдаваць 10 кілограм грубых і 14 кілограм сакавітых кармоў, 900 грам канцентратаў.

Курмыза Сямён,

загадчык жывёлагадоўчых ферм калгаса „Першае мая" Пружанскага раёна.

Арганізаваная праверка спісаў

Па-святочнаму ўпрыгожана памяшканне Ліноўскага сельскага совета. Па ўсяму бачна, што набліжаецца знамянальны дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. На фасадзе дома вывешаны лозунгі, плакаты, прысвечаныя выбарам. Адзін вялікі і ўтульны пакой займае Ліноўская ўчастковая выбарчая камісія Пружанскага раёна. У спецыяльна афармленых рамках вывешаны акуратна-напісаныя спісы выбаршчыкаў.

У 9 гадзін раніцы за сталом камісіі пазяўляецца дзяжурны — старшыня камісіі тав. Леўшын, які актыўна ўдзельнічае ўжо ў правядзенні выбарчай кампаніі.

5 дзён прайшло з дня апублікавання спісаў выбаршчыкаў. Участковая камісія разам з агітатарамі арганізавала іх праверку і ўдакладненне. Агітатары робяць праверку шляхам падворнага абходу, а таксама запрашаюць выбаршчыкаў зайсці ва ўчастак і праверыць спісы.

Кожны дзень ва ўчастковую камісію прыходзіць да ста выбаршчыкаў, каб самім асабіста пераканацца, аб вернасці занясення ў спісы. Іх тут ветліва сустракае дзяжурны Леўшын, дапамагае выбаршчыку дакладна праверыць спіс.

Паказальна, што ніхто з выбаршчыкаў не знайшоў памылак у спісах. Ні адной заявы ў камісіі пакуль што няма.

Хутка наступяць восеньскія сумеркі. З мястэчка Лінова і бліжэйшых вёсак ва ўчастак прыходзяць многа выбаршчыкаў. Тут старшыня сельсовета тав. Чарнуха Сцяпан, старшыня ўчастковай камісіі тав. Леўшын, агітатар Казловіч Канстанцін наладжваюць чытку газет, арганізоўваюць гутаркі і кансультацыі па пытаннях выбараў, калектыўнае слуханне радыёперадач.

Пружаны. **Ф. Нікіфараў.**

Парушаюць закон аб працы

Прапоўны дзень у чайнай распачынаецца рана. Першай прыходзіць кухонная работніца Ніна Гарох. Да 7 гадзін, калі сходзяцца ўсе работніцы, у яе ўжо растоплена печка, прыгатавана вада. Не лічачыся з часам, працуюць і астатнія работніцы чайнай: буфетчыцы Берко і Берхольц, афіцыянткі Ракевіч і Макарчэня, повар Надзежда Гардзейка. Іх не здарма тут называюць стахановкамі.

Афіцыянткі, напрыклад, скончыўшы работу, самі мыюць падлогу. Ім не магла дагадзіць прыбіральшчыца, якая наспех і неакуратна прыбірае памяшканне.

На вялікі жаль загадчык чайнай і стаповай Прастакоў і віраўнікі гарпо не толькі не заахвочваюць такіх работніц, але груба парушаюць закон аб працы. Тут павялося так, што людзі працуюць без выхадных дзён, а повар штодзённа працуе па 13—14 гадзін. Старшыня гарпо тав. Карпач імкнуўся выказаць здзіўленне па гэтай справе. Але мала хто паверыць яго наведанню таго, што афіцыянткі працуюць без выхадных дзён, бо ў веданні гарпо знаходзяцца толькі адна чайная і адна сталовая.

Беспрыкладная пячуласць да сваіх работнікаў тут праяўляецца і ў іншым. Работніцы прасілі хаця намнога навучыць іх пісаць. На гэтую просьбу не адазваліся.

Няма чаго і гаварыць пасля гэтага аб якой-небудзь растлумачальнай рабоце сярод афіцыянтак, буфетчыц і іншых работнікаў чайнай. У гэтым вялікая віна і райкома комсамола, які выкінуў з поля сваёй дзейнасці маладых работніц. Замест выхаваўчай работы з работнікамі чайнай, тут адмініструюць, загадчык сталовай Прастакоў без усякага поваду пагражае работніцам тым, што аддасць пад суд. Сам Прастакоў часта прыходзіць на работу ў 11 — 12 гадзін дня.

С. Сурэўцова.

г. Косава.

Палепшыць абслугоўванне пасажыраў

У Пружанах ёсць невялікая станцыя адкуль пасажыры едуць па вузкалейнай дарозе да Аранчыц. Кожны дзень поезд робіць па 4 рэйсы з Пружан у Аранчыцы і назад.

Аднак на гэтых двух станцыях у Пружанах і Аранчыцах не створаны ўмовы для пасажыраў. На станцыі Пружаны мала скамеек, брудна і пасажыры знаходзяцца на вуліцы. У вагонах поезда цёмна, холадна. Нават няма свечак.

Такое становішча з абслугоўваннем пасажыраў і ў Аранчыцах.

М. Гурэвіч.

За годы Сталінскіх пяцігодак вакол Кузнецкага металургічнага камбіната ім. Сталіна вырас новы сацыялістычны горад Сталінск. На здымку: Праспект Молатава ў гор. Сталінску.

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 14 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што германскія самалёты бамбардыравалі ўчора Лондан і Паўднёвую Англію. Бамбардыроўцы падвергліся заводы і чыгуначныя збудаванні на ўсім узбярэжжы. Англійскія знішчальнікі спрабавалі перашкодзіць бамбардыроўцы і атакаваць германскія знішчальнікі. Пры гэтым быў збіт англійскі знішчальнік. Два другіх самалёты не вярнуліся на сваю базу.

Учора вечарам англійскія самалёты спрабавалі зрабіць налёт на Берлін. Аднак ў выніку моцнага зенітнага агня ім не ўдалося прарвацца праз заграджальную зону да горада. Свой груз бомб яны скінулі за лініяй горада на населеныя прадмесці. Узнікла некалькі пажараў, якія ўдалося хутка патушыць. Акрамя гэтага ніякія другія страты не былі прычынены.

Мінулай ноччу, не гледзячы на неспрыяючае надвор'е, германскія самалёты працягвалі налёты на Лондан. Асабліва сур'ёзныя пашкоджанні прычынены чыгуначным збудаванням у паўночна-заходняй частцы горада. Моцныя ўзрывы адбыліся ў Вест-Індскіх доках і другіх частках Лондана. Узмоцненай бамбардыроўцы падвергліся Ліверпуль і Ковентры, а таксама некаторыя парты на ўзбярэжжы Ла-Манша. На працягу сённяшняга дня германскія самалёты бамбардыравалі многія ваенныя аб'екты ў Лондане і Паўднёвай Англіі.

Англійскія паведамленні

Афіцыяльна паведамляецца, што ў ноч на 13 лістапада непрыяцель аднавіў свае атакі на Англію. Гэтыя атакі адбываліся ў шырокіх маштабах. Бамбардыроўка Лондана прадаўжалася з перапынкамі ўсю ноч. Ёсць пашкоджанні і афіары. Налёты на цэнтральныя графствы і раёны ракі Мерсей не былі вельмі цяжкімі. У розных пунктах скінуты бомбы. Прычыненыя страты нязначныя і колькасць афіяр невялікая. Скінуты таксама бомбы ў асобных пунктах суседніх з Лонданам графстваў і ў паўднёва-ўсходняй частцы Англіі, дзе прычынены нязначныя страты і налічваецца некаторая колькасць афіяр.

У ноч на 13 лістапада англійскія самалёты падвергалі бамбардыроўцы нафтасховішчы ў Гельзенкірхене і Кельне. Затым былі скінуты бомбы ў рачным парту Дуйсбурга і на чыгуначныя вузлы і заводы ў Рурскай абласці. Бамбардыроўцы падвергліся таксама базы падводных лодак у Лорыяне і доках ў Флісінгене і Дэнкерку. Акрамя таго, налёт зроблен на непрыяцельскія аэрадромы. Адзін англійскі самалёт не вярнуўся на сваю базу.

13 лістапада ў другой палавіне дня германскія самалёты скінулі невялікую колькасць бомб на некаторыя прыбярэжныя гарады графства Кент.

Агенцтва Рэйтэр перадае паведамленне, у якім гаворыцца, што ў ноч на 14 лістапада над Англіяй лятала невялікая колькасць непрыяцельскіх самалётаў. Бомбы скінуты над адным з раёнаў Лондана, а таксама над некалькімі пунктамі Паўднёва-Усходняй Англіі. У Лондане і ў некаторых месцах Усходняй і Паўднёва-Усходняй Англіі былі прычынены пашкоджанні жылым будынкам. У другіх раёнах, падвергшыхся бамбардыроўцы, матэрыяльныя страты невялікія.

Налёт англійскай авіяцыі на Берлін

ЛОНДАН, 14 лістапада (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр з Нью-Йорка, англійскія самалёты зрабілі налёт на Берлін у ноч на 14 лістапада, у той час як Молатаў даваў банкет у чэсць вышэйшых кіраўнікоў Германіі. Госці Молатава заставаліся ў совецкім паўпрэдстве да адбоя паветранай трывогі, данага сёння раніцой.

Барацьба англійскіх рабочых

ЛОНДАН, 15 лістапада. (ТАСС). Рабочыя трох галоўнейшых суднаверфей Глазго адмовіліся прыняць новыя ўмовы працы, азначаючыя падоўжанне рабочага тыдня і скарачэнне заработнай платы для некалькіх катэгорый рабочых. Прадпрыемцы забаранілі рабочым работаць па старай сістэме і аб'явілі лакаут.

Рабочы камітэт саюза электрыкаў Манчэстэра прыняў рэзалюцыю, выражаючую рашучы пратэст супроць адмовы прадпрыемцаў павялічыць заработную плату механікам—членам гэтага саюза.

ІТАЛЬЯНСКАЯ ЗВОДКА

РЫМ, 14 лістапада. (ТАСС). Італьянскае камандванне паведамляе: „У зоне Калебакі пры ўдзеле авіяцыі было адбіта некалькі атак праціўніка. Нашы самалёты рабілі налеты на войскі непрыяцеля ў зоне возера Прэспа, бамбардыравалі аэрапорт Панас, Аргостолі і Урэвеза, дзе пражаны ваенныя аб'екты і падвергалі кулямётнаму абстрэлу калоны праціўніка. Грэчаская авіяцыя бамбардыравала Валону, дзе ёсць 6 забітых і 30 раненых. У цэнтральным раёне Міжземнага мора збіта 3 самалёты праціўніка, ва ўсходняй частцы—2.

Нашы самалеты-тарпеданосцы зрабілі ва ўсходняй частцы Міжземнага мора налёт на караван суднаў праціўніка і тарпедавалі 2 параходы, адзін з якіх затануў. Другое паветранае злучэнне зрабіла мінулай ноччу налёт на марскую базу ў Александрыі (Егіпет), дзе былі скінуты бомбы на непрыяцельскі крэйсер, які знаходзіўся у парту.

На аэрадроме Маактэн Багуш у рэзультаце бамбардыроўкі згарэў адзін самалёт праціўніка, тры другіх сур'ёзна пашкоджаны. Усе нашы самалёты, якія прымалі ўдзел у гэтых аперацыях, вярнуліся на свае базы. Авіяцыя бамбардыравала Бардзію, Дэрна і Бенгазі. Страты нязначныя.

Ва Усходняй Афрыцы праціўнік зрабіў учора беспаспяховы артылерыйскі абстрэл нашых пазіцый ля Галабата.

Самалёты праціўніка зрабілі налёты ў Італіі на Кротоне, дзе бомбы ўпалі ў мора, а таксама на Таранто, дзе ёсць трое забітых і 22 раненых; пашкоджаны жылыя дамы".

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

У Паўднёвым Кітаі. У паўднёва-заходняй частцы правінцыі Гуандун за апошні час упартыя бои адбываліся на подступах Цыньчжоу. У гэтым сэктары кітайцы, заняўшы рад пунктаў, прасунуліся ушчыльную да Цыньчжоу. Авангардныя часці кітайскіх войск некалькі раз займалі ўскраіны гэтага горада, але былі вымушаны адыйсці пад націскам пераважаючых сіл японцаў. Пасля таго, як кітайцы падцягнулі ў гэты раён рэзервы, японцы былі вымушаны пакінуць Цыньчжоу, які знаходзіўся ў іх руках на працягу аднаго года.

У паўднёва-заходняй частцы правінцыі Гуансі японскія войскі зноў перайшлі ў наступленне ў раёне Чэньнаньгуань. Бо[illegible] жорсткі характар.

На востраве Хайнань, адкуль [illegible]чаецца канцэнтрацыя японскіх войск. Па [illegible] вестках туды прыбылі дзве новыя японскія пяхотныя дывізіі. Усяго на востраве ёсць каля трох дывізій японскіх войск.

У Цэнтральным Кітаі. У паўночнай частцы правінцыі Цзянсі бои адбываюцца у раёне Аньі, дзе кітайскія войскі выбілі японцаў з рада пунктаў.

У правінцыі Хубэй японцы вядуць наступленне супроць кітайскіх войск у раёне Ічана. Кітайцы спрабуюць затрымаць прасоўванне японцаў.

У паўднёвай частцы правінцыі Хунань кітайскія войскі цясняць японцаў паблізу Ошьяна. Асобныя атрады кітайскіх войск падышлі да варот горада.

У Паўночным Кітаі. У паўднёвай [illegible] правінцыі Шаньсі [illegible] асобн[illegible] [illegible]ца ва[illegible] [illegible]уночным [illegible] [illegible]ніклія су[illegible] [illegible] паўночнай [illegible] [illegible]ыч[illegible] [illegible]ыноу. [illegible]ЗО).

ВАЙНА ПАМІЖ ГРЭЦЫЯЙ І ІТАЛІЯЙ

ЛЮБОІНА (на югаслаўскай граніцы), 14 лістапада. (ТАСС). Пасля меўшай месца 12 лістапада моцнай гарматнай перастрэлкі і налётаў італьянскіх бамбардыроўшчыкаў на грэчаскія пазіцыі учора ўноў настала зацішша. Грэкі адышлі на пазіцыі, знаходзячыяся недалёка ад грэка-албанскай граніцы. Італьянскія самалёты прадаўжаюць бамбардыраваць мост Пуло-Пегово, звязваючы азёры Вялікае і Малае Прэспа, каб перашкодзіць снабжэнню перадавых грэчаскіх часцей узбраеннем і прадуктамі харчавання. 12 лістапада на гэты мост скінута больш 50 бомб.

Албанскія пагранічныя часці пакінулі свае пазіцыі на албана-югаслаўскай граніцы і адышлі ў невядомым напрамку.

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ў Ограндскім праліве англійскія караблі зрабілі нападзенне на караваны італьянскіх суднаў, састаяўшых з 4 транспартаў, якія суправаджаліся 2 эсмінцамі. Адзін транспарт патоплен, 2 другіх пашкоджаны. Адзін з эсмінцаў таксама атрымаў пашкоджанні. Англійскія караблі пашкоджанняў не атрымалі.

Зводка вярх ўнага камандвання грэчаскай арміі

АФІНЫ, 14 лістапада. (ТАСС) Вярхоўнае камандванне грэчаскай арміі паведамляе, што ўчора грэчаскія самалёты бамбардыравалі аэрадромы Корчы, знішчыўшы на зямлі вялікую колькасць самалётаў праціўніка. Бамбардыроўцы падвергліся таксама скапленні непрыяцельскіх войск. Авіяцыя праціўніка зрабіла ўнутры краіны налёты на гарады і вёскі, якія не маюць ніякага ваеннага значэння. Ёсць некалькі забітых і раненых.

У рэзультаце паспяховага наступлення ў раёне гор Піпд грэчаскімі войскамі заняты вовы вышыні на албанскай тэрыторыі.

Авіяцыя праціўніка бамбардыравала Аргостолион, на востраве Кефалінія, дзе ёсць некаторая колькасць афіяр. Налёту падвергліся таксама востраў Лефкас і 2 вёскі ў Пелапанесе. Афіяр і разбурэнняў няма.

Англа-італьянская вайна

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). У камунікаце камандвання англійскіх паветраных сіл гаворыцца: „У Італьянскай Усходняй Афрыцы наша авіяцыя бамбардыравала Бах-дар (на возеры Тана). У Зула нашы самалёты абстралялі з кулямётаў непрыяцельскі гідрасамалёт, які затануў. Каля вострава Харміл (Красное мора) бамбардыраваны непрыяцельскае судно і рад другіх ваенных аб'ектаў".

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). Газета „Таймс" указвае, што з чэрвеня на Мальце было аб'яўлена 180 паветраных трывог. Італьянская авіяцыя ў часе налётаў на Мальту страціла 28 самалётаў, англійская—3 самалёты.

Карантын у Цуруге супроць Чумы

ТОКІО, 14 лістапада. (ТАСС). Газета „Цуручэ Дзідзі" паведамляе, што адміністрацыя тамажні ў Цуруге (Японія) у сувязі з эпідэміяй чумы, ахапіўшай паўночную частку Манчжурыі, падвергае строгаму карантыну суднаў, пр[illegible] бываючыя з Карэі і Манчжурыі. Паліцэйскія улады распарадзіліся зрабіць прывіўку усей камандзе парахода „Харбін-Мару", які курсіруе на еўрапейска-азіяцкай лініі.

Раскрыццё новага загавору ва французскай арміі ў Сірыі

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). Кайрскі карэспандэнт газеты „Ньюс кронікл" паведамляе, што надаўна другі раз за апошнія два месяцы французскія улады ў Сірыі раскрылі новы загавор у арміі, арганізаваны прыхільнікамі генерала де-Голя.

Рост цэн на харчовыя прадукты ў Англіі

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). Група відных англійскіх эканамістаў апублікавала бюлетэнь аб руху цэн на харчовыя тавары ў Англіі. У бюлетэні ўказваецца, што цэны на тавары ўзраслі з пачатку вайны на 47 процантаў. У бюлетэні ўказваецца таксама, што цэны на розныя роды матэрыялы павялічыліся за гэты перыяд да 37 процантаў.

Мінеральныя ўгнаенні — залог высокіх ураджаяў

Сацыялістычнае земляробства нашай краіны з кожным годам атрымоўвае ўсё новыя і новыя перамогі ў справе павышэння ўраджайнасці. Выдатныя дасягненні сацыялістычнай сельскай гаспадаркі дэманстраваліся на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы 1939 і 1940 гадоў.

Перадавікі калгасаў атрымалі ў гэтым годзе высокі ўраджай зернавых і тэхнічных культур. Вялікую ролю ў павышэнні ўраджайнасці сацыялістычных палёў адыгралі мінеральныя ўгнаенні, бо для спрыяючага росту культурных раслін неабходны такія спажыўныя матэрыялы, як кіслород, вадарод, вуглерод, азот, фосфар, калій і інш.

Кіслород і вадарод расліны атрымоўваюць з паветра, вуглерод — з вуглекіслаты паветра, а астатнія спажыўныя матэрыялы расліны бяруць з глебы праз сваю карнявую сістэму. Асабліва неабходны раслінам азот, фосфар і калій. Азот ідзе на пабудову бялковай матэрыі, ад якой залежыць рост усёй расліны. Фосфар таксама ўваходзіць у склад бялка. Калій знаходзіцца ў лісцях, сцяблах і насенных раслін.

Адсутнасць у глебе аднаго з указаных элементаў цягне за сабой гібель раслін. Штогодна з ураджаем з глебы ўносіцца вялікая колькасць спажыўных матэрый. Так, ураджай аднаго центнера жыта ўносіць з глебы: азота 34,5 кілограма, фосфарнай кіслаты 20,6 кілограма, калія 89 кілограмаў. Ураджай 300 центнераў бульбы забірае з глебы 150 кілограмаў азота, 54 кілограмы фосфара і 274 кілограмы калія.

З гэтых лічбаў відаць на колькі вялікі расход спажыўных матэрый у глебе. І калі запас спажыўных матэрый не папаўняецца, то глеба паступова ўсё больш і больш абядняецца і зніжаецца ўраджайнасць. Каб пазбегнуць абяднення глебы спажыўнымі матэрыямі ў яе неабходна ўносіць угнаенні.

Мінеральныя ўгнаенні даюць вялікую прыбаўку ўраджаю, як зернавых, так і тэхнічных культур. Ураджай жыта ад прымянення фасфарытнай мукі павялічваецца на 3—4 центнеры на кожны гектар, ад прымянення калійных угнаенняў — на два з палавінай центнеры. Не меншы ўплыў аказваюць мінеральныя ўгнаенні і на павышэнне ўраджайнасці тэхнічных культур. З усяго гэтага ясна тая велізарная роля, якую адыгрываюць мінеральныя ўгнаенні ў нашай сельскай гаспадарцы.

Аднак, не гледзячы на гэта выбарка ўгнаенняў калгасамі нашай вобласці ідзе вельмі марудна. Зараз на складзе „Сельгасхімнаба" маецца 600 тон калійных і 86 тон азотных угнаенняў, невыбраных калгасамі. Многія кіраўнікі райземаддзелаў і старшыні калгасаў не прымаюць ніякіх мер да таго, каб выбраць угнаенні.

Толькі два раёны ў вобласці — Кобрынскі і Антопальскі,—забралі прызначаныя для калгасаў угнаенні. У Брэсцкім, Баразаўскім, Самаціцкім, Маларыцкім і Дамачэўскім раёнах мінеральныя ўгнаенні ляжаць мёртвым капіталам.

Сярод некаторай часткі кіраўнікоў калгасаў існуе няправільная думка, што быццам-бы ўплыў на павышэнне ўраджайнасці аказваюць толькі фосфарныя ўгнаенні, а азотныя (селітра і сульфат амонія) і калійныя (сельвініт і калійная соль) не аказваюць ніякага дзеяння. Гэта, безумоўна, наверная думка. Задача райземаддзелаў— шырока растлумачыць калгаснікам і бядняцка-сераднацкім гаспадаркам вялікае значэнне прымянення мінеральных угнаенняў у павышэнні ўраджайнасці.

Е. Панава, агранам абласной канторы „Сельгасхімнаба".

Адкаэны рэдактар Г.Т. МІНЧУКОЎ

Адрас рэдакцыі: г. Брэст, вуліца імені Карла Маркса 20, Тэлефоны 1 — 17, 1—23, 6—19

Друкарня ім. [illegible]

—УД 579